№ 41 (586)
Лістапад 2015 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года
bfk.by

## У нумары:

☞ Прадаўжальнікі: *«Мілавіца», патрэбная дзяржаве* – *стар. 3*

☞ Асяродак: *захаванне памяці пра полацкую даўніну* – *стар. 4*

☞ Этнакасмалогія: *Птушыная дарога, два Вазы, Зорны кол ды іншыя аб'екты* – *стар. 5*

## *8 лістапада – прысвятак Змітра*

На Дзісеншчыне спявалі :

*«Святы Зміцер – ён на усіх хіцер:*
*Салады салодзіць, піва робіць,*
*Сыноў жэніць, дачок выдаець...»*



*Колішні будынак бровара (канец XIX – пач. XX ст.) у в. Вароўскага (былая сядзіба Тышкевічаў «Дзядзілавічы») Барысаўскага раёна*

## *На тым тыдні...*

✓ **20 кастрычніка** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбыўся **творчы вечар Рыгора Сітніцы «Канцэрт для скрыпкі і завірухі»** і адкрылася **выстаўка яго мастацкіх працаў**.

Р. Сітніца нарадзіўся 1 студзеня 1958 г. у вёсцы Курыцічы Петрыкаўскага раёна на Гомельшчыне. Скончыў Рэспубліканскую школу па музыцы і выяўленчым мастацтве, Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Прысутныя даведаліся пра старшыню Беларускага саюза мастакоў не толькі як пра таленавітага творцу, але і не менш здольнага паэта.

✓ **20 кастрычніка** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь прайшла **акцыя «Музей дзецям з velcom»**. Пад час яе адбылося адкрыццё інтэрактыўнай музейна-спазнавальнай прасторы, была паказаная мадэрнізаваная зала «Жывая археалогія» і прадстаўлены першы ў краіне дзіцячы гістарычны часопіс «Музейныя вандроўкі».

✓ **20 кастрычніка** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва адкрылася **выстаўка «Фатаграфіі Станіслава Ігнацыя Віткевіча "Віткацы" (1885 – 1939)»**. Праект падрыхтаваны Польскім Інстытутам у Мінску, выстаўка праходзіць у рамках Месяца фатаграфіі ў Мінску.

Фатаграфіі С. Віткевіча – аднаго з самых значных польскіх мастакоў і пісьменнікаў XX ст. – выклікаюць натуральную цікавасць. Выстаўка прадстаўляе самыя лепшыя з захаваных фотаздымкаў, створаныя Віткевічам у першыя 30 гадоў жыцця, а таксама фатаграфіі міжваеннага двухгоддзя.




✓ **21 і 22 кастрычніка** ў Маладзечне адбылася **Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Культурная спадчына роду Агінскіх і яе значэнне для сучаснага развіцця грамадства»**, прысвечаная 250-годдзю з дня нараджэння выдатнага кампазітара, грамадскага і дзяржаўнага дзеяча Міхала Клеафаса Агінскага. Арганізатары – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Маладзечанскі дзяржаўны музычны каледж імя М.К. Агінскага, Мясцовы дабрачынны фонд «Спадчына М.К. Агінскага». З прывітальным словам да навукоўцаў пяці краінаў звярнуўся дырэктар каледжа, старшыня праўлення фонду «Спадчына М.К. Агінскага», заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Рыгор Сарока.

*Падрабязней пра канферэнцыю чытайце ў адным з наступных нумароў.*

✓ **21 кастрычніка** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва адкрылася **выстаўка «Fashion is my passion! Модная індустрыя 70-х – 90-х гадоў: беларускі фармат»**. Выстаўка ладзіцца ў рамках Месяца фатаграфіі ў Мінску.

✓ **23 кастрычніка** ў Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі імя Е.Р. Раманава пачала працу **выстаўка «Златканая адзнака годнасці»**. Экспазіцыя сфармаваная з прадметаў прыватнай калекцыі, дзе прадстаўленыя кунтушовыя паясы, фрагменты дэкаратыўных тканінаў, выробленых на мануфактурах Рэчы Паспалітай, Францыі і Расійскай імперыі. Выстаўку дапаўняюць працы мастака-графіка Уладзіміра Басалыгі з фондаў Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя П.В. Масленікава.

✓ **24 кастрычніка** ў Дуброўне пад час **рэгіянальнага агляду-конкурсу «Вялікая вясельніца»** можна было пабачыць рэканструкцыю вяселля канца XIX – пачатку XX ст. Яно спалучала элементы вясельных абрадаў з розных рэгіёнаў: збіралі нявесту і ладзілі выкуп па дубровенскай традыцыі, а бацькі сустракалі маладых так, як гэта было прынята ў Гарадку. Таксама ў вяселле былі ўплецены элементы абрадаў Лёзненскага раёна. Адчуць атмасферу свята ўдзельнікам дапамагалі народныя фальклорныя калектывы «Кудзеліца» (Дубровенскі раён) і «Глейна» (Гарадоцкі раён).

✓ **З 26 кастрычніка па 3 лістапада** ў Полацку адбыўся **фестываль праваслаўнай культуры «Кладезь»**. Яго духоўна-асветніцкая праграма ўключае больш за дзесяць праектаў, якія праходзяць у адукацыйных і культурных установах і ў Полацкім псіханеўралагічным доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў.

На другі дзень фестывалю адбыўся паказ дакументальнага фільма «Два Андрея» рэжысёра Галіны Адамовіч. Таксама тут размясцілася культурна-гістарычная экспазіцыя «Скрыпторый» – узноўленая манастырская майстэрня па перапісцы рукапісаў. Яе наведнікі змогуць пабачыць, як змяняліся кнігі цягам стагоддзяў.

✓ **27 кастрычніка** ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў адкрылася **выстаўка жывапісу «Дзённік Просьбіта» мастака Марэка Ормандзіка**. Выстаўка арганізаваная ў супрацоўніцтве з Пасольствам Славацкай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь з дапамогай галерэі «Артплац».

✓ **28 кастрычніка** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася **вечарына «Якуб Якубоўскі ў беларуска-татарскім культурным адраджэнні»**. Да імпрэзы была прымеркаваная прэзентацыя кнігі «Мы з Іманам жывем на зямлі Беларусі: беларускі татарын Якуб Якубоўскі» (аўтары-укладальнікі – Іван Драўніцкі і Таццяна Якубоўская) і выстаўка «Здабыткі Якуба Якубоўскага», якая расказвае пра гэтага чалавека, удзельніка адраджэнцкага руху (не толькі беларускіх татараў) у 1990-х гг.

# Песні ад Бярэзіны да Белай Воды

***Два разы на год у Свята-Елісавецінскім манастыры, што на паўночным ускрайку Мінска, праходзіць фестываль праваслаўных спеваў «Державный глас». Сёлета пасля свята Пакроваў прайшла 14-я сустрэча. Сустрэча акурат таму, што на гэтым фестывалі няма спаборніцтваў, журы, месцаў, перамагаюць усе і атрымліваюць падзячныя граматы.***



*Спеўная малітва дзяцей з хора «Тоника»*

Доўжыўся фестываль тры дні. Першы быў аддадзены прэм'ернаму паказу дакументальнага фільма Студыі ў імя Іаана Воіна «Два Андрэі». Стужка распавядае пра духаўніка Свята-Елісавецінскага манастыра протаіерэя Андрэя Лемяшонка і протаіерэя з Кастрамы паэта Андрэя Логвінава. Апроч рэжысёра фільма Галіны Адамовіч у сустрэчы браў удзел лідар вядомага расійскага гурта «Комба БАКХ» Аляксей Логвінаў. Гэта сын святара з Кастрамы, які выконвае песні на вершы бацькі.

Наступнага дня ў храме ў гонар Божай Маці «Дзяржаўная» Свята-Елісавецінскага манастыра адбыўся асноўны канцэрт. Удзел бралі дзіцячы хор «Тоника» дзіцячай музычнай школы № 1 Мінска, камерны хор «Преображение» з Барысава, хор «Покров» з Варонежа, а таксама госці з Сербіі: Небайша Масцілавіч з групаю «Пирг» і іераманах Серафім (Петкавіч). На жаль, не змаглі прыехаць удзельнікі фальклорнага ансамбля «Многая лета» з Кіева.

Выступіўшы першымі, дзеці з музычнай школы № 1 задалі мерапрыемству агульны святочны настрой. Уласна, дзіцячыя спевы заўсёды прыгожыя, а іх малітва, кажуць, шчырая.

Традыцыяй на фестывалі сталі не толькі царкоўныя спевы і творы праваслаўных аўтараў, але і народныя песні. Цяперашні канцэрт не стаў выключэннем. Усцешна, што з кожным разам беларуская песня гучыць усё шырэй; цяпер чакайма, калі пад час фестывалю загучаць і беларускія рэлігійныя творы ды творы з беларускай хрысціянскай спадчыны. А гэты пласт у нашай культуры багаты.

Яшчэ адной цікавосткаю сталі выступленні гасцей з Сербіі.

Іераманах Серафім (Петкавіч), настаяцель манастыра Святой Тройцы ў Белай Водзе, залетась заснаваў гурт «Србче». На фестывалі спяваў свае песні пад гітару разам з духоўным чадам Нэлаю. За два гады ў калектыва было шмат канцэртаў у Сербіі, Босніі, Чарнагорыі, а. Серафім часты госць і ў нашай краіне, выступаў у Мінску, у сталічным храме Святога Мікалая Японскага, у Пінску. Прыязджае гэты чалавек і з матэрыяльнай дапамогаю нашым храмам, манастыру. Выйшлі два аўдыяальбомы, якія можна знайсці і ў інтэрнэце (як і запісы наступных гасцей з Балканаў).

Гурт «Пирг» прадстаўлялі Арсеній Арсеніевіч і Небайша Масцілавіч. У суправаджэнні гітары прагучалі песні пра хрысціянства на Балканскім паўвостраве, пра месцы, звязаныя з сербскімі святымі. Відаць, свой адбітак наклала не зусім звычная нам славянская сербская мова, але гэтыя выступленні слухаліся адрозна ад спеваў беларусаў ды рускіх. Нездарма па сканчэнні канцэрта ўзнік своеасаблівы ажыятаж вакол імправізаванай кропкі продажу CD, дзе прадавалі альбомы гуртоў «Србче» і «Пирг», а потым – чарга па дабраславенне а. Серафіма і па аўтографы.

Трэцяга дня адбылася творчая сустрэча з акцёрамі тэатра і кіно, выканаўцамі духоўных песень Аленай і Аляксандрам Міхайлавымі з Масквы. Госці – лаўрэаты I Маскоўскага маладзёжнага фестывалю аўтарскай духоўнай песні ў імя св. Рамана Салодкапеўцы «Исповедь сердца». А. Міхайлаў вядомы як выдатны кінаакцёр, які здымаўся ў фільмах «Формула кахання», «Зорка і смерць Хаакіна Мур'еты», «Рамэа і Джульета», «Міхайла Ламаносаў» ды інш.

*Уладзімір ПУЧЫНСКІ, фота аўтара*



*Н. Масцілавіч (справа) і а. Арсеній*



*Іераманах Серафім і Нэла*

***Рэдкалегія і рэдакцыя «Краязнаўчай газеты» шчыра ўдзячная нашым чытачам і аўтарам за ўвагу да нашага выдання. Але, на жаль, часам бываюць прыкрыя выпадкі, што ўскладняюць падрыхтоўку артыкула ды ілюстрацыяў да друку. На гэта і хочацца звярнуць увагу сяброў.***

**Тэкст.** Артыкул або нататка павінны быць набраныя ў тэкставым рэдактары Microsoft Word, захаваныя ў фармаце .rtf, як варыянт – .doc, але не .docx (на жаль, гэты фармат на сёння дае найбольшую колькасць памылак з-за збою). Як варыянт, могуць быць і іншыя тэкставыя рэдактары (да прыкладу, бясплатныя AbiWord або OpenOffice ды падобныя), але абавязковая ўмова — захоўваць у фармаце .rtf. Шрыфт (гарнітура, памер, іншыя параметры, а таксама абзацныя водступы) можа быць абраны самастойна (мы прапануем Arial, 13 пунктаў, паўтара інтэрвала, абзацны водступ 1,25 см).

Пазначайце па магчымасці поўнасцю імёны і прозвішчы асобаў, згаданых у тэксце, расшыфроўвайце ініцыялы аўтара артыкула, а таксама абрэвіятуры і скарачэнні.

Газета друкуе матэрыялы на беларускай мове; рэдакцыя перакладае тэксты ў выключных выпадках, загадзя агавораныя пры сустрэчы, па тэлефоне або праз электронную пошту.

**Ілюстрацыі.** Малюнкі, рысункі, фотаздымкі павінны быць захаваныя ў фармаце .jpg (.jpeg) або .tiff. Пажадана 300 кропак на цалю (dpi), дапускаецца не меней за 1024 пікселі па большым баку, ці памерам не менш за 500 кілабайтаў. Ілюстрацыі не трэба ўстаўляць у тэкставы дакумент, а прымацоўваць асобна або архіваваць некалькі фота (малюнкаў) і прымацоўваць да пісьма архіў. Не забывайцеся пазначаць, на якой ілюстрацыі хто або што адлюстраваны. Калі ёсць магчымасць, пазначайце аўтарства здымка або малюнка, рысунка (або крыніцу іх паходжання).

Што ж да фота на паперы, то не дасылаце, калі ласка, ксеракопіі ілюстрацыяў.

Просім сяброў звярнуць увагу на гэтыя просьбы і рэкамендацыі пры супрацоўніцтве з рэдакцыяй «Краязнаўчай газеты». Спадзяемся, нашыя стасункі будуць плённыя і зычлівыя.

***Будзем разам рабіць нашую з вамі «Краязнаўчую газету»!***

ГА «Беларускі фонд культуры» і рэдакцыя «Краязнаўчай газеты» выказваюць шчырыя спачуванні мастацкаму рэдактару газеты Наталлі Юр'еўне КУПРЭВІЧ **з прычыны смерці маці.**

*З жалем паведамляем: 2 лістапада 2015 г. на 92-м годзе жыцця памёр даўні сябра Беларускага фонду культуры польскі навукоўца, беларусіст, грамадска-культурны дзеяч Польшчы і Беларусі, нашчадак князёў Мсціслаўскіх і Заслаўскіх* ***Анджэй ЦЕХАНАВЕЦКІ.***

Ён з'яўляўся ганаровым старшынёй беларуска-польскай камісіі па пытаннях рэстытуцыі і ўзначальваў сумесную працу беларускіх і польскіх навукоўцаў, рэстаўратараў па аднаўленні палаца-паркавага ансамбля ў г. Нясвіжы, стварыў Міжнародны фонд «Нясвіж», перадаваў Нацыянальнаму гісторыка-культурнаму запаведніку «Нясвіж» Радзівілаўскія рарытэты.

Анджэй Станіслаў Цеханавецкі нарадзіўся 28 верасня 1924 г. у Варшаве. Вывучаў гісторыю мастацтваў у Ягелонскім універсітэце, затым удасканальваў адукацыю ў Германіі, ЗША, Партугаліі, Вялікабрытаніі. З 1961 г. жыў у Лондане. Мае шэраг высокіх узнагародаў, у тым ліку ўзнагароджаны медалём Францыска Скарыны, з'яўляецца ганаровым доктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Выканкам ГА «Беларускі фонд культуры», рэдкалегія «Краязнаўчай газеты»*



# Нобелеўская лаўрэатка на Бярэзіншчыне

***Навіна аб прысуджэнні пісьменніцы Святлане Алексіевіч Нобелеўскай прэміі ластаўкай абляцела ўсю краіну, ускалыхнула сэрцы не толькі кнігалюбаў і бібліятэкараў, але і бадай што кожнага беларуса, нават за межамі краіны. Радаваліся ўсе.***

Першая кніга С. Алексіевіч «У вайны не жаночы твар» адразу трапіла ў фонды бярэзінскіх бібліятэк і заняла там пачэснае месца, бо ў ёй змешчаныя ўспаміны пяці нашых землячак – удзельніцаў вайны. У канцы 1985 г. на базе гарадскога кінатэатра «Юбілейны» адбылася прэзентацыя кнігі з удзелам яе гераіняў: Тамары Давідовіч, Любові Любчык, Эстэн Кажамятнікавай. 17 чэрвеня 1988 г. С. Алексіевіч прыязджала ў Беразіно, дзе сустрэлася з бярэзінскімі кнігалюбамі. На памяць пісьменніца пакінула аўтограф на кнізе, якая цяпер з'яўляецца рарытэтам раённай бібліятэкі.

Бярэзінскія бібліятэкары вырашылі стварыць міні-тэатралізацыю пяці кніг пісьменніцы, выбраўшы самыя пранікнёныя старонкі. На суд першых гледачоў былі вынесены тэатр маналога «Успаміны людзей, як званы». Маналог-споведзь стаў асноўным сцэнічным прыёмам першага бібліятэчнага Тэатра кнігі. З аднолькавай цікавасцю тэатр маналога паводле кніг С. Алексіевіч слухалі ў школьным класе і ў швейным цэху, на пасяджэннях грамадскіх таварыстваў і аматарскіх суполак, на жаночых сустрэчах і літаратурных вечарынах.




У 2008 г., да 60-годдзя пісьменніцы, супрацоўнікі раённай бібліятэкі зладзілі аўкцыён твораў С. Алексіевіч «Выкупі кнігу рэкламай» з пяццю лотамі: «Не жаночая справа – вайна», «Малыя ахвяры вялікай вайны», «Афганскі лабірынт даўжынёй у 10-годдзе», «Чалавек у люстры смерці», «Чалавечыя лёсы, апрамененыя атамам». Аўкцыён праводзіўся шляхам «выкупу» кнігі рэкламай – вызначэннем яе літаратурна-мастацкіх якасцяў, што дазволіла скласці рэйтынг твораў пісьменніцы. Найбольш папулярным сярод чытачоў стала кніга «Чарнобыльская малітва».




У 2004 – 2005 гг., да 60-годдзя вызвалення Беларусі і 60-годдзя Перамогі пачаў дзейнічаць тэатр кнігі С. Алексіевіч «У вайны не жаночы твар». Монаспектаклі «Салдатам я прайшла па той вайне», «Сімфонія для феі ў салдацкім шынялі» ў 2009 – 2010 гг. дапоўніліся новымі: «У Перамогі жаночы твар», «Белыя анёлы ў пекле вайны». Да 20-годдзя выводу савецкіх войскаў з Афганістана адбылася бібліятэчная вечарына «Хрышчоныя Афганістанам», у якой бралі ўдзел бярэзінцы – колішнія «афганцы» і іх жонкі. Былі прадстаўленыя маналогі ўдавы і маці паводле кнігі С. Алексіевіч «Цынкавыя хлопчыкі». У 2011 г., да 25-годдзя Чарнобыльскай трагедыі, адбыўся ўрок смутку Бярэзінскай раённай бібліятэкі «Белы бусел – чорны цень» паводле кнігі «Чарнобыльская малітва». Тэатралізаваныя маналогі «Каханне мацнейшае за радыяцыю» адной з гераінь «Чарнобыльскай малітвы» – жонкі пажарнага Васіля Ігнаценкі, чыё імя носіць адна з вуліцаў Беразіно, прайшлі не толькі ў вучнёўскіх класах і працоўных калектывах, але і пад час экскурсіяў у пажарную часць горада. Калі ў 2013 г. бярэзінскія бібліятэкары праводзілі шырокамаштабную кампанію па прафілактыцы суіцыду, у 16-і арганізацыях і ўстановах горада гучаў тэатр маналога «Недаспяваная песня жыцця» паводле кнігі С. Алексіевіч «Зачараваныя смерцю».

Сёлета, да 70-годдзя Перамогі, жыхары бярэзінскіх аграгарадкоў мелі магчымасць пабачыць тэатралізаваныя прадстаўленні «Ішлі дзяўчаты па вайне», «Рэквіем па забітым вайной каханні», «Дзеці без дзяцінства» паводле кніг «У вайны не жаночы твар» і «Апошнія сведкі». Гучалі пранікнёныя маналогі гераіняў С. Алексіевіч і пад час акцыяў «Тры пакаленні жанчын супраць вайны», «Жаночы праклён вайне» ў працоўных калектывах горада, на вечарыне «Іх дзяцінства забрала вайна», зладжанай для тых жыхароў Беразіно, якія пабачылі вайну дзецьмі.

Ужо дванаццаць гадоў кнігі пісьменніцы, якія ажывіў тэатр нашай бібліятэкі, шчыра размаўляюць са слухачамі. Ёсць добрая навіна для бібліятэкараў і настаўнікаў, для ўсіх прыхільнікаў творчасці пісьменніцы: у наступным навучальным годзе кнігі С. Алексіевіч будуць уключаны ў школьную праграму. А пісьменніца працуе над новай, сёмай, кнігай.

*Тамара КРУТАЛЕВІЧ,*
*загадчыца аддзела маркетынгу*
*Бярэзінскай ЦБ*

# «Парасткі» і «Журавінкі», між іх рассыпаліся «Зярняткі»

Сёння многія беларусы лічаць, што добра там, дзе нас няма. Яны стараюцца «прымасціцца да чужога караваю», з'ехаць у развітыя еўрапейскія краіны ці ў Амерыку. **Але ці шчаслівы той чалавек?** У наш час адбываецца сусветная глабалізацыя, і, на жаль, нікуды ад гэтага не падзецца. Калі раней «гарадскія» дзеці саромеліся сваіх «вясковых» бацькоў, якія не так сталі ці не так сказалі, то цяпер гэтая тэндэнцыя пашыраецца да ўзроўню дзяржавы, нацыі. Сёння вартасць нацыі вымяраецца эканамічнымі паказнікамі краіны. Але ці слушна гэта рабіць? У пагоні за грашыма мы часта губляем свае нацыянальныя карані і традыцыі, а беларусам сапраўды ёсць чым ганарыцца. Сёння беларускія фальклорныя матывы дастаткова папулярныя. На вуліцы можна сустрэць моладзь з гаджэтамі «Apple», упрыгожанымі беларускім арнаментам. На французскім тыдні высокай моды сёлета была прадэманстраваная калекцыя, дзе ў адзенні былі скарыстаныя элементы беларускага арнаменту і традыцыйнага крою.

На жаль, у сучасным свеце з'явілася шмат «патрыётаў», якія ставяць каштоўнасці сваёй нацыі вышэй за іншыя і гатовыя забіваць усіх, хто думае інакш. Таму асабіста мне прыемна, што беларусаў лічаць талерантнымі і памяркоўнымі, што нашы людзі часта аддадуць апошняе, замест таго, каб адбіраць чужое. Наша культура ніколі не была жорсткай і агрэсіўнай, а каштоўнасць чалавека вымяралася не грашыма, а асабістымі якасцямі, стаўленнем да іншых, уменнем паводзіць сябе ў грамадстве. І нашы «цёмныя» і «непрасунутыя» продкі мелі цэласную сістэму нацыянальнага светапогляду, якія перадавалі наступнікам праз народныя песні, абрады, традыцыі. Так, у гульнях і жартах закладаюцца асновы моўнай культуры, першыя жыццёвыя прынцыпы дзіцяці. Таму вельмі важна для бацькоў і настаўнікаў падтрымаць і скіраваць першыя крокі маленькага чалавека ў правільным напрамку.

Вядома, што «няма смачнейшае вадзіцы, чым з роднае крыніцы». **Але дзе ж знайсці крыніцу, вада з якой зможа спатоліць адвечную смагу, каб у дзіцячых душах з'явіліся парасткі любові да сваёй краіны? Дзе знайсці тую пуцяводную зорку, што пакажа шлях да сапраўдных спрадвечных каштоўнасцяў нашага народа?** Менавіта такая маленькая зорачка «Мілавіца» заззяла 25 гадоў таму ў цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь», што ў Кастрычніцкім раёне Мінска; і з таго часу несупынна нясе святло народнай аўтэнтычнай культуры дзецям і дарослым. «Мілавіца» – гэта дзіцячы фальклорны калектыў, пры вытоках якога сталі самаадданая праца і любоў да беларускай культуры нязменнага кіраўніка калектыва Марыі Сітнко.

Сёння там працуюць сапраўды зацікаўленыя людзі; яны добра ўсведамляюць, якую каштоўнасць уяўляе сабою скарб беларускага аўтэнтычнага фальклору. Акрамя Марыі Васільеўны неабходна ўспомніць этнахарэографа калектыва Мікалая Козенку. Яны шукаюць, адаптуюць і развучваюць з дзецьмі найлепшыя ўзоры песень, гульняў, жартаў, забаўлянак, прыпевак і танцаў з розных рэгіёнаў Беларусі, імкнучыся захаваць усе мясцовыя асаблівасці вымаўлення і гучання твораў, асаблівасці рухаў і пастраення танцаў і карагодаў, якія заўсёды суправаджаюцца толькі жывой музыкай. На баяне віртуозна грае нязменны акампаніятар калектыва Аляксандр Булойчык, а некаторыя мелодыі на гармоніку і дудачцы выконваюць і маленькія ўдзельнікі, з якімі дадаткова займаецца Аксана Ровенская.



*Выступленне ў г. Кельцэ*

У калектыве ёсць групы рознага ўзросту: маленькія «Зярняткі», сярэднія «Парасткі», старэйшыя «Журавінкі», а таксама ўнікальная група для бацькоў і бабуляў ад 18 да 80 – сямейны клуб «Стрэчанне». І хаця заняткі праводзяцца па групах (методыка працы залежыць ад узросту ўдзельнікаў), на канцэртах і святах усе спяваюць разам – як у даўнія часы, калі вечарамі збіраліся і старыя, і малыя. На нядаўнім выніковым канцэрце было прыемна пабачыць, як за год вырас калектыў: «Зярняткі» рассыпаліся па ўсёй сцэне, дружна гукаючы бусла, а калі на апошні паклон сабраліся ўсе выступоўцы – дык ім ледзь хапіла месца. А калі б сабраць разам усіх дзяцей, якія выраслі разам з «Мілавіцай» за гэтыя гады – напэўна, малая была б і актавая зала Мінскага дзяржаўнага каледжа электронікі, што гасцінна адчыняе штогод дзверы для правядзення выніковага канцэрта.

Улетку калектыў таксама парадаваў вынікамі ўдзелу ў 42 Міжнародным фестывалі дзіцячай культуры ў г. Кельцэ (Польшча), з якога дзеці прывезлі не толькі трэцюю залатую елачку (кубак пераможцы), але і ганаровы тытул «Найлепшы фальклорны калектыў».

***Сёлета «Мілавіца» адзначае юбілей. Таму давайце пажадаем гэтаму сапраўды народнаму калектыву натхнення, новых ідэяў і поспехаў!***

*Наталля ГЕРМАН,*
*настаўніца пачатковых класаў*
*СШ № 71, г. Мінск*

# Сведкі гераічнага мінулага

***90 гадоў таму, у верасні 1925 г., быў падпісаны Пратакол пасяджэння прэзідыума Полацкага акруговага выканкама аб заснаванні Краязнаўчага музея. Экспазіцыя найстарэйшага музея горада не раз мянялася, але да гэтага часу ў наведнікаў усіх узростаў яна выклікае цікавасць. Як палачане, так і госці нашага горада асаблівую ўвагу надаюць экспазіцыі, прысвечанай падзеям Айчыннай вайны 1812 г. на Полаччыне.***

Полацк быў захоплены 25-тысячным французскім войскам пад камандаваннем маршала Удзіно 14 ліпеня 1812 г. Праз два дні праціўнік рушыў на поўнач у бок Себежа з мэтаю злучэння з арміяй Макдональда. Рускі корпус генерал-лейтэнанта П. Вітгенштэйна, колькасцю ўсяго 18 тыс. чалавек, не павінен быў прапусціць французаў да расійскай сталіцы Санкт-Пецярбурга.

Цягам трох дзён (18 – 20 ліпеня) непадалёк вёскі Клясціцы (сёння ў Расонскім раёне) адбываліся кровапралітныя баі. П. Вітгенштэйну ўдалося атрымаць важную перамогу, якая праславіла яго імя. Смелы і рашучы, ён быў узнагароджаны ордэнам Святога Георгія 2-й ступені. Акрамя таго, у гонар «выратавальніка Пецярбурга», як назваў Пятра Хрысціянавіча імператар Аляксандр І, было выпушчана мноства яго гравіраваных выяваў.



**Медаль з выявай П. Вітгенштэйна**

Адзін з памятных медалёў з барэльефным профілем знакамітага военачальніка сёння знаходзіцца ў экспазіцыі Краязнаўчага музея. Медаль быў адліты з чыгуну на Аланецкім Аляксандраўскім заводзе (сёння г. Петразаводск, Рэспубліка Карэлія) у першай трэці XIX ст. Пры гэтым чыгун быў ужыты ліцейшчыкамі зусім не з-за дэфіцыту бронзы. На думку майстроў, менавіта гэты метал надаваў партрэтным медалям асаблівую ўрачыстасць і выразнасць.

Другі не менш адважны рускі генерал Я. Кульнёў пад час пераследавання адыходзячых французаў трапіў у засаду і быў смяротна паранены гарматным ядром. Герой бітваў пад Клясціцамі перад смерцю папрасіў зняць з сябе мундзір з узнагародамі: *«...Пусть неприятель не знает, что ему удалось убить русского генерала. Не уступайте ни пяди земли. Спасайте Отчизну!»*. Сам Напалеон назваў адважнага камандзіра адным з лепшых кавалерыйскіх генералаў расійскай арміі.

На месцы гібелі генерала Кульнёва яшчэ ў XIX ст. быў усталяваны помнік, макет якога можна ўбачыць у экспазіцыі Краязнаўчага музея.

Значныя бітвы руска-французскай вайны больш за 160 гадоў таму адлюстраваў у сваіх 12-і карцінах нямецкі мастак-баталіст Петэр Хес. На жаль, палатно «Бітва пры Полацку» лічыцца зніклым. Аднак захаваліся копіі ўсіх твораў. На двух з іх, што прадстаўленыя ў Краязнаўчым музеі, можна ўбачыць, як разгортваліся падзеі пад Клясціцамі ў ліпені 1812 г., а затым і ў самім Полацку ў пачатку кастрычніка. Копіі выканаў больш за паўстагоддзя таму таленавіты полацкі мастак Кандрат Маеўскі.

Цікавым фактам з'яўляецца тое, што ў штурме горада актыўна ўдзельнічалі жыхары вёскі Жарцы Полацкага павета. Яшчэ да пачатку баёў за вызваленне Полацка сяляне невялікага атрада Максіма Маркава, узброеныя косамі, сякерамі, халоднай і агнястрэльнай зброяй, захоплenай у праціўніка, пастаянна не давалі спакою французам, чым аказвалі істотную дапамогу рускім войскам. У 1817 г. 22 селяніны гэтага атрада былі ўзнагароджаныя срэбнымі медалямі «У памяць Айчыннай вайны 1812 года», што само па сабе стала падзеяй выключнай: тагачасная ўзнагародная сістэма не прадугледжвала воінскіх узнагародаў для прыгонных.

Не менш вядомае імя разведчыцы Фядоры Міронавай. Прыгонная сялянка памешчыка Гласко жыла ў вёсцы Пагуршчына і хадзіла ў стан ворага, лічыла гарматы, перадавала інфармацыю аб размяшчэнні французаў.

Пасля заканчэння вайны ў лістападзе 1815 г. Ф. Міронавай было выдадзенае пасведчанне з высокай адзнакай яе подзвігу. Яго копія захоўваецца ў полацкім музеі. Узнагароджаная срэбным медалём «За карыснае» сялянка з Полаччыны разам з сям'ёй была вызваленая ад прыгону. Яна таксама атрымала з казны 500 рублёў – немала на той час грошы. Сёння імя адважнай сялянкі носіць адна з вуліцаў горада.

З улікам значнасці перамогаў пад Полацкам, у 1835 г. было прынятае рашэнне ўсталяваць у горадзе і ў в. Клясціцы помнікі «Ва ўспамін Айчыннай вайны 1812 года».



**Даламан афіцэра егерскага палка і ківер**

У Полацку 24-метровы манумент з чыгуну ўсталявалі насупраць Мікалаеўскага сабора. На ўрачыстым адкрыцці 26 жніўня 1850 г. прысутнічаў і будучы імператар Расійскай імперыі Аляксандр II. У 1935 г. помнік-капліца быў знесены «на металл для нужд первой пятилетки». Доўгі час толькі макет помніка, што цяпер знаходзіцца ў экспазіцыі Краязнаўчага музея і быў выкананы ў 1950-я гг. К. Маеўскім, даваў магчымасць палачанам і гасцям горада даведацца, як выглядаў манумент, што больш за 80 гадоў упрыгожваў Корпусную плошчу. У снежні 2009 г. помнік мужнасці і гераізму людзей, якія вызвалялі Полацк, быў адноўлены і зноў стаў своеасаблівай візітнай карткай горада.

У музейнай экспазіцыі, прысвечанай падзеям 1812 г. на Полаччыне, прадстаўлена некалькі ўзнагародаў у гонар перамогаў рускай арміі ў бітвах з французамі. Адна з іх – медаль з цёмнай бронзы «У памяць Айчыннай вайны 1812 года». Узнагарода была прызначаная для прадстаўнікоў дваранства і купецтва, якія садзейнічалі перамозе рускай арміі (срэбраным «баявым» медалём узнагароджвалі толькі ўдзельнікаў баёў).



**Бронзавы медаль «У памяць Айчыннай вайны»**

Другая ўзнагарода – медаль са светлай бронзы, заснаваны ў стогадовы юбілей Айчыннай вайны. Медалём адзначаліся ўсе воінскія чыны, якія бралі ўдзел у святах, ад салдата да генерала, што знаходзіліся на службе *«в тех войсковых частях..., которые участвовали в Отечественной войне 1812 года, от начала её до окончательного изгнания неприятеля из пределов России, с 12 июня по 25 декабря 1812 г.»*. На яго правым баку – пагрудная выява Аляксандра І. На адваротным баку – надпіс: «1812 СЛАВНЫЙ ГОДЪ СЕЙ МИНУЛЪ, НО НЕ ПРОЙДУТ СОДЕЯННЫЕ ВЪ НЕМЪ ПОДВИГИ 1912». Усе, хто атрымаў права на ўзнагароду, павінныя былі «приобретать медаль за свой счёт».

Асаблівай увагі заслугоўвае форменнае адзенне часоў вайны з Напалеонам. Ваўкавыскім ваенна-гістарычным музеем імя П. Баграціёна Краязнаўчаму музею Полацка ў 1980-я гг. быў перададзены даламан афіцэра гусарскага палка французскай арміі, пашыты з белага сукна і ўпрыгожаны меднымі гузікамі і срэбнымі шнурамі. Прыцягвае ўвагу наведнікаў і ківер – галаўны ўбор вышынёй 25,5 см з плеценымі касіцамі і этышкетам па баках. Акрамя таго, што ківер з'яўляецца часткай форменнай вопраткі рускіх салдатаў, ён выкарыстоўваўся імі для захоўвання лыжкі, шчотачкі для вусоў, грошай, люлькі з тытунём.

Яркая вайсковая форма рускай кавалерыі XIX ст. мела мноства дэкаратыўных элементаў. У камплект гусарскай амуніцыі сярод іншага ўваходзіла лядунка – скураная патронная сумка. У экспазіцыі музея прадстаўленая лядунка для ніжніх чыноў кавалерыі.



**Французскі пісталет**

***Усіх, хто цікавіцца тэмай руска-французскай вайны 1812 г., фактамі і часам незвычайнымі дэталямі тых падзеяў, запрашаем зазірнуць у Краязнаўчы музей Полацка, які захоўвае ўнікальныя прадметы – сведкаў гераічнага мінулага нашай зямлі.***

*Анастасія КІСЛЯК,*
*старшы навуковы супрацоўнік Краязнаўчага музея, філіяла НПГКМЗ*

# Беларуская этнакасмалогія: невядомае пра наша зорнае неба

*У Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь адбылося цікавае і спазнавальчае для наведнікаў мерапрыемства «Этнапарадыгма», у прыграме якога лекцыя «Беларуская этнакасмалогія» вядомага даследчыка і супрацоўніка НАН РБ Цімафея Авіліна, а таксама камерныя выступленні гурта інтуітыўнай імправізацыі «Князь Мышкін» і этна-гурта «Альтанка».*

Што да назвы адукацыйнага мерапрыемства «Этнапарадыгма», то слова «парадыгма» (ад грэчаскага *paradeigma* – прыклад, узор) азначае «сукупнасць тэарэтычных і метадалагічных перадумоваў, якія вызначаюць канкрэтнае навуковае даследаванне і з'яўляюцца мадэллю, узорам пастаноўкі і рашэння даследніцкіх задачаў» – так тлумачыць гэтае паняцце Вікіпедыя.

Відавочна, што арганізатары «Этнапарадыгмы» ставілі сабе за мэту паказаць на разнастайных прыкладах узоры таго, што і як даследуецца ў сумежных з этнаграфіяй галінах навукі і мастацтва. Адсюль і назва лекторыя.

Пакуль такія імпрэзы ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі яшчэ рэдкасць. Але шлях нацыянальнай самаідэнтыфікацыі патрабуе ўзмацнення асветніцкіх крокаў для адкрыцця новых парадыгмаў, якія б спрыялі больш пільнаму погляду беларусаў на нацыянальную мастацкую спадчыну, у тым ліку і на шэдэўры Бялыніцкага-Бірулі, Рушчыца, Хруцкага, Драздовіча, што ўпрыгожваюць залу беларускага мастацтва музея.

Думаю, што Цімафей Авілін, якому першаму далі слова, не чакаў такой зацікаўленасці наведнікаў музея да інфармацыі, якую ён прапанаваў ім пад час лекцыі. Ну сапраўды, для многіх стаў адкрыццём той факт, што ў Беларусі, як нідзе, захавалася шмат цікавых паданняў адносна астранамічных з'яваў, такіх, як наша галактыка, бачных сузор'яў, планетаў, спадарожніка Зямлі – Месяца... Усе яны маюць у народзе свае адметныя назвы: напрыклад, Млечны шлях па-нашаму завецца Птушынай дарогай. Паданне, па словах Ц. Авіліна, гаворыць, што Бог стварыў гэтае зорнае скопішча для таго, каб птушкі ведалі, куды ляцець на зіму, у якім напрамку вырай. Але зафіксаваныя і такія назвы, як Чумацкі шлях, Дарога на Кіеў. Бо гэтая астранамічная з'ява ўказвала дарогу ў той бок, куды чумакі рушылі па соль. Гэта вынік практычнага выкарыстання астраноміі нашымі продкамі. А вось калі казаць пра метафізічны сэнс назваў, то беларусы верылі, што Птушынай дарогай ходзяць святыя, а душы памерлых адлятаюць па ёй у лепшы свет.



Ц. Авілін распавядае пра беларускае зорнае неба

Ц. Авілін падрабязна спыніўся на этымалогіі беларускай назвы сузор'я Вялікая Мядзведзіца. Ён зазначыў, што, магчыма, старажытныя беларусы ў гэтай з'яве бачылі калясніцу язычніцкага бога Перуна. Таму і народная назва сузор'я была Воз (адпаведна, Вялікі і Малы Вазы) ці Калясніца. Зафіксаваныя і іншыя назвы: Чарпак, Коўш. З Возам звязаная ўнікальная легенда: яна кажа, што гэтае сузор'е – вялікая зорная калясніца, а самая маленькая зорка ў ім – нібыта сабака на вяроўцы. І вось калі гэты сабака перагрызе сваю прывязь, надыдзе канец свету.

Цікавымі падаліся слухачам інтэрпрэтацыі назваў сузор'я Арыён. Беларусы называлі яго Касцы, бо нібыта пасля таго, як яно з'яўлялася на небе, пачыналіся працы ў полі. Былі зафіксаваныя і такія назвы, як Каромысел і Тры Каралі (маюцца на ўвазе біблейскія Тры Валхвы).

А вось Плеяды ў беларускім народзе зваліся Сіта, альбо мелі агульнаеўрапейскую назву – Курачкі. Таксама зафіксаваныя назвы Стажары, Валасажар, Кучкі, Купкі, Сем мальцаў. Палярная зорка ў беларускай этнаастраноміі называлася Паўночнай зоркай, Зорным колам, бо ніколі не мяняла свайго месца на зорным небасхіле і заўсёды вандроўнікам паказвала напрамак на поўнач.

Шмат увагі Ц. Авілін надаў такой астранамічнай з'яве, як зоркі, што падаюць, бо нашыя продкі верылі: кожная з іх – гэта душа чалавека. Таму лічылася дурнотай тыцкаць у неба пальцам, бо можна было патрапіць ім у чужую ці ў сваю душу і так загубіць яе. Слухачы таксама даведаліся, як у нас звалася Венера. А мела яна імя Ранішняя ці Вячэрняя зорка. Яшчэ адна прыгожая назва гэтай планеты – Дзянніца.



Л. Нарушэвіч



Д. Лаўрэнцьева

Трэба адзначыць, што Ц. Авілін анансаваў хуткі выхад сваёй кнігі, у якой ён абагульніў усе свае даследаванні, вынікі этнакасмалагічных экспедыцыяў па шматлікіх рэгіёнах краіны. Гэтая навіна выклікала шмат пытанняў да лектара, прымусіла Цімафея прачытаць для цікаўных сваю інтэрактыўную лекцыю яшчэ раз, хоць і ў тэзісным варыянце.

А ў гэты час на сцэну ўжо выйшлі ўдзельнікі гурта «Князь Мышкін». Музыкі прапанавалі слухачам музычную кампазіцыю, якая, па словах лідара гурта Лявона Нарушэвіча, была задуманая як своеасаблівы эмацыйны адпаведнік далікатнай музейнай атмасферы: музыкі шмат выкарыстоўвалі акустычных інструментаў, у прыватнасці – старажытны інструмент аўстралійскіх абарыгенаў – дзіджэрыду, набор разнастайных званочкаў ды іншых дробных ударных. Выканаўцы засяроджваліся на імправізацыйна-джазавай частцы кампазіцыі, на гармоніі акустычных гукаў і тэмбраў незвычайных інструментаў, на суладдзі з музейнай аўрай. І гэта ім удавалася.

Этна-гурт «Альтанка» яшчэ раз засведчыў, што яго ўдзельнікам уласцівае імкненне да зменаў у лепшы бок. Так, гурт зрабіў крок ад банальнай балалаечнай капэлы да паўнавартаснага беларускага этнічнага музычнага калектыву. Свой варты ўнёсак у добрыя змены ў вобразе «Альтанкі» зрабіла і салістка Дар'я Лаўрэнцьева, якая надала сваімі спевамі гэтаму струннаму ансамблю лірызму і пранікнёнасці. Мо таму слухачы цёпла віталі новыя кампазіцыі гурта – апрацоўкі народных песень «Купала», «Юр'я», «Голуб на дубочку», «Як на рэчы».

Наведнікі музея, шматлікія слухачы сваёй зацікаўленасцю і апладысментамі выказвалі надзею на новыя спазнавальчыя сустрэчы.

*Анатоль МЯЛЬГУЙ, фота аўтара*

*Наш каляндар*

# Зыгмунт Глогер –
## 170 гадоў з дня нараджэння

Вядомы польскі археолаг, этнограф, гісторык, фалькларыст Зыгмунт Глогер нарадзіўся 3 лістапада 1845 г. у в. Тыборы-Камёнка Ломжынскага павета Аўгустоўскай губерні (цяпер Высокамазавецкі павет, Падляскае ваяводства, Польшча).

Вучыўся ў Варшаўскім універсітэце. Скончыў Кракаўскі універсітэт (1870). З 1870 г. у маёнтку Яжэва пад Тыкоцінам. Зрабіў шмат фальклорна-этнаграфічных і краязнаўчых экспедыцыяў па Польшчы, Беларусі, Літве. Першыя этнаграфічныя працы пачаў у 1867 г.

Арганізатар і першы старшыня Польскага краязнаўчага таварыства ў Варшаве. У археалагічных даследаваннях вучонага цікавілі праблемы каменнага веку. Раскопваў курганы каля Ваўкавыска, удзельнічаў з М. Федароўскім у археалагічных і этнаграфічных экспедыцыях.

З. Глогер – аўтар каля 800 навуковых працаў і артыкулаў. Яго асноўная праца «Geografia historyczna ziem dawnej Polski» («Гістарычная геаграфія земляў старажытнай Польшчы», 1900; змешчаныя матэрыялы пра ВКЛ, Беларусь) ініцыявала шырокія даследаванні ў галіне спецыяльных гістарычных дысцыплінаў. Сярод іншых працаў: «Вясельныя ўрачыстасці» (1869, пад псеўданімам Прускі; змясціў беларускія матэрыялы з Брэсцкага і Трокскага паветаў), «Кніга рэчаў польскіх» (1896), «Польскі год у жыцці, традыцыі і песні» (1900), «Драўлянае будаўніцтва і вырабы з дрэва ў даўняй Польшчы» (т. 1–2, 1907–1909) і інш. Выдаў зборнік фальклору «Старадаўнія думы і песні», «573 кракавякі» (абодва ў 1877), «Гадавыя звычаі» (1882), «Песні люду» (1892) і інш.



Пра жыццё, звычаі, абрады і вераванні беларускага народа пісаў у артыкуле «Земляробчыя абрады» (1867), «Звычаі народа з ваколіц Тыкоціна і Бельска» (1868), «Забабоны і ўяўленні наднарвенскага люду пра птушак, паўзуноў і насякомых» (1877) і інш. Беларускія матэрыялы ёсць і ў працах пра краязнаўчыя падарожжы: кніга «Далінамі рэк: Апісанні падарожжа ўздоўж Нёмана, Віслы, Буга і Бебжы» (1903), артыкулы «З-над Нёмана» (1872), «Падарожжа Нёманам» (1888), «На хвалях Бута» (1890), «У даліне Бебжы» (1892) і інш. Даследаваў помнікі археалогіі каменнага і бронзавага вякоў на Гродзеншчыне, Брэстчыне.

Сабраў у Яжэве багатую бібліятэку, вялікую музейную калекцыю археалагічных, этнаграфічных, археаграфічных, нумізматычных і сфрагістычных матэрыялаў. Тут захоўваліся беларускія матэрыялы са збораў М. Федароўскага, А. Кіркора, К. і Я. Тышкевічаў, А. Ельскага і інш. У яго «Старапольскай энцыклапедыі» (т. 1 – 4, 1900 – 1903, 5-е выд., 1985) каля 1 000 ілюстрацыяў, шматлікія беларускія матэрыялы па гісторыі, геаграфіі, драўлянай і мураванай архітэктуры, кнігадрукаванні, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, якія З. Глогер збіраў і даследаваў усё жыццё. Памёр 15 жніўня 1910 г., пахаваны на могілках Старыя Павонзкі ў Варшаве.

З 1983 г. у Польшчы праводзіцца конкурс і заснаваны медаль імя Зыгмунта Глогера за асаблівыя дасягненні ў даследаванні, ахове і развіцці культуры.

*Падрыхтаваў Алесь САЧАНКА*

# Сустрэча з зямлячкай

Правядзенне чытанняў, арганізацыя сустрэчаў з творчымі асобамі – у шэрагу формаў працы Дзяржынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, якой кіруе ўлюбёная ў сваю справу дырэктар Валянціна Клімовіч. Нядаўна тут адбылася сустрэча аматараў мастацкага слова з жыхаркай Хабараўска Ірынай Оркінай. Яна добра вядомая ў Расіі паэтэса і мастачка, сябра Саюза мастакоў Расіі, сябра Міжнароднай асацыяцыі выяўленчых мастацтваў ЮНЕСКА. І хаця яна жыве ўдалечыні ад Радзімы (беларуска, нарадзілася ў Мазыры), але яе заўсёды цягне ў Беларусь, у Мазыр, дзе жывуць яе бацька Арсеній Пархоменка і сястра Таццяна.

У Дзяржынску яна, як і ў Мінску, была ўпершыню, заехала ў наш горад літаральна на тры дні да сваіх родзічаў. Пачатак выступлення Ірына Арсеньеўна прысвяціла сваім бацькам. Яе маці Юлія Васільеўна нарадзілася ў Нараўлянскім раёне, у выселенай цяпер вёсцы Цешкаў. У гады Вялікай Айчыннай вайны змагалася супраць ворага ў партызанскім атрадзе, а пасля выкладала ў мазырскай школе рускую мову і літаратуру. Бацька Арсеній Іванавіч быў выгнаны ў Германію, а пасля вызвалення трапіў у сталінскія лагеры. Па вайне працаваў рабочым на прадпрыемствах Мазыра. Нядаўна дзеці і ўнукі віншавалі яго з 90-годдзем. З вялікім гумарам расказала Ірына Арсеньеўна пра дзеда Васіля, які вылучаўся вялікай працаздольнасцю: меў некалькі кароваў, поўны двор свіней, куры, гусі. Жонка яго не магла ўпраўляцца з такой вялікай гаспадаркай, і дзед на падмогу прывёў з хутара другую жонку. Так яны і жылі: у адной палове вялікай хаты адна жонка, а ў другой палове – другая. А дзед займаў сярэдні між імі пакой. А калі тыя пачыналі між сабой сварыцца, на месяц-два кідаў іх і сыходзіў упрочкі. Быў ён магутны як волат, меў несварлівы, талерантны беларускі характар. Да вайны дзед Васіль, як моцны гаспадар, быў раскулачаны і высланы на будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага канала. Але выжыў.



*І. Оркіна (справа) пад час сустрэчы з чытачамі*

Нарадзілася Ірына ў Мазыры, а калі ёй споўнілася 5 гадоў, бацькі пераехалі на сталае жыццё ў в. Залатуха, што ва Уладзімірскай вобласці (Расія). Там дзяўчына скончыла школу, а пасля Абрамцаўскае мастацкае вучылішча імя В. Васняцова. Па заканчэнні вучобы была накіраваная ў Хабараўск, дзе скончыла Хабараўскі дзяржаўны педагагічны інстытут па спецыяльнасці «графіка». Тут жа адбылося яе станаўленне як мастака-графіка, кераміста, паэта, педагога. І. Оркіна не толькі на Далёкім Усходзе лічыцца адным з вядучых прадстаўнікоў постмадэрнісцкага мастацтва ў кераміцы і графіцы. Пра яе кажуць, што гэта мастак, здольны заўсёды здзіўляць сваімі ідэямі, і пры ўсім вельмі працалюбны. Яе творы экспанаваліся ў Японіі, Францыі, ЗША, некалькі разоў у Германіі, а таксама ў Мазыры. У Маскве са сваімі творамі яна таксама часты госць.

І. Оркіна вядомая і як аўтар вершаў, за якімі стаіць свая філасофія. Шмат яе керамічных і графічных прац суправаджаюцца вершамі, што адлюстроўваюць сутнасць экспаната або малюнка. На гэтай аснове і пабудаваная кніга «Стихографика» (2008), вершы з якой госця прачытала прысутным. А першая кніга «Свой круг» выйшла ў 2000 г. Пазнаёміла І. Оркіна і са сваёй новай кнігай – «Скульптура свободных ассоциаций», у якой адказала на частае пытанне: чаму абрала менавіта такі, а не іншы напрамак творчай дзейнасці. У канцы 1990-х гг. І. Оркіна з кампазітарам Сяргеем Маскаевым рэалізавала творчы праект «Звуки и образы Вселенной». Яе калярова-графічныя кампазіцыі ў суправаджэнні музыкі сімфанічнага аркестра стварылі незабыўны эфект гармоніі Космасу і яго сувязі з зямным жыццём.

Вядомая І. Оркіна і як таленавіты педагог. Мінулай зімой яе запрасілі ў Якуцк, дзе вучыла дзяцей мастацтву керамікі, а ў Невельску (востраў Сахалін) праводзіла майстар-клас. Па ініцыятыве жанчыны ў Хабараўску нарадзілася свята – тут пачалі штогод адзначаць Дзень ганчара. І. Оркіна вельмі любіць падарожнічаць. Яна расказала прысутным, што вандравала ў тундры на аленях і сабаках, над тайгой у верталёце, у нанайскай лодцы на прасторах Амура.

І. Оркіна падарыла бібліятэцы сваю кнігу «Стихографика», быў зроблены агульны фотаздымак.

На наступны дзень, нягледзячы на халоднае дажджлівае надвор'е, творца накіравалася ў Мінск, дзе ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» наведала выстаўку керамікі «Кола агню». А напярэдадні ад'езду з Дзяржынска госця ў вёсцы Станькава пазнаёмілася з старажытным Станькаўскім паркам, які ў 1860-х гг. заклаў граф Эмерык фон Гутэн-Чапскі. Наведала яна і адроджаную Свята-Мікалаеўскую царкву, якую ў 1961 г. ператварылі ў руіны. Яе гідам па цікавых станькаўскіх мясцінах быў архітэктар, краязнаўца, мастак, аўтар праекта рэстаўрацыі царквы Алег Маслієў. Аўтар жа гэтых радкоў расказаў госці пра гістарычныя падзеі на тэрыторыі Беларусі: пра ВКЛ, вялікіх князёў, пра Беларускую Народную Рэспубліку, пра К. Астрожскага, К. Каліноўскага, І. Дамейку, пра выдатных беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. Для яе, якая пражыла амаль усё жыццё ў Расіі, гэтыя факты і імёны былі амаль невядомыя. Але я спадзяюся, што змог абудзіць у ёй цікавасць да нашай агульнай Радзімы – Беларусі. Суразмоўца запэўніла, што яна, акрамя Мазыра, будзе наведваць і іншыя мясціны Беларусі. І трэба спадзявацца, што падобныя сустрэчы будуць ладзіцца і надалей, што творца наведае цікавыя куточкі нашай Бацькаўшчыны.

*Лявон ЦЕЛЕШ,*
*г. Дзяржынск*



*І. Оркіна і А. Маслієў*

## *У тэатры «Зьніч»*

**У лістападзе тэатр аднаго акцёра «Зьніч» запрашае на вечаровыя спектаклі, якія пачынаюцца а 19-й гадзіне.**

**9 лістапада** на сцэне – паэтычна-драматычны монаспектакль **«Красёнцы жыцця»** паводле паэмы Якуба Коласа «Новая зямля», зразумелай амаль кожнаму чалавеку, які хацеў бы знайсці ў сусвеце нейкі куток, што стаў бы яго Радзімай... Выканаўца – заслужаны артыст Беларусі Алесь Кашпераў, аўтар інсцэніроўкі і рэжысёр-пастаноўшчык спектакля – Галіна Дзягілева.

**11 лістапада** аб сутнасці любові словамі Анатоля Вярцінскага «Што значыць зямное шчасце здабыць? Любіць...» будзе разважаць Галіна Дзягілева ў паэтычным монаспектаклі **«Любіць»**. Музычнае суправаджэнне зладзяць Кірыл Успенскі і Максім Цэхановіч (гітара).

**12 лістапада** ў тэатры будзе ісці музычна-паэтычны спектакль **«У краіне светлай, дзе я ўміраю...»** паводле самых вядомых твораў Максіма Багдановіча. Аўтары інсцэніроўкі – Вячаслаў Статкевіч і Аляксандр Шундрык, рэжысёр-пастаноўшчык – Галіна Дзягілева. Выканаўца – В. Статкевіч, музычнае суправаджэнне Сяргея Сарокіна.

**16 лістапада** монаспектакль **«Нобіль – Барвяны Уладар»** паводле аповесці Уладзіміра Караткевіча «Сівая легенда» прадставіць заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Уладзімір Шэлестаў. Яго вуснамі прамаўляе герой аповесці Раман Ракута, маналог якога пераўтвараецца ў сапраўдную легенду аб нашым народзе.

**18 лістапада на сцэне** – рамантычная монаопера **«Адзінокі птах»**, прысвечаная жыццю і творчасці Адама Міцкевіча. Пра апошні дзень жыцця паэта ў Стамбуле 26 лістапада 1855 года распавядзе выканаўца Андрэй Марозаў. Кампазітар – Алег Залётнеў, аўтар лібрэта і рэжысёр-пастаноўшчык – Галіна Дзягілева.



*«Адзінокі птах»*

*Спектаклі праходзяць у Зале бібліятэкі імя А. Міцкевіча Культурнага цэнтра касцёла Св. Сымона і Св. Алены. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па мінскім тэлефоне: 331-75-53.*

# Тэатр жыцця Алеся Шатэрніка

16 кастрычніка адзначыў 75-годдзе добра вядомы не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах, скульптар Алесь Шатэрнік, аўтар шматлікіх мемарыяльных дошак, знакаў, помнікаў выбітным беларусам, манументальных скульптурных кампазіцыяў. Усім вядомыя створаныя ім скульптуры «Гуканне вясны» (1980) і «Развітанне» (2014), якія атрымалі прапіску на праспекце Пераможцаў у Мінску. Свой юбілей творца адзначыў выстаўкай жывапісных краявідаў «Тэатр майго жыцця».



Экспазіцыя размясцілася ў Дзяржаўным музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, яе прадставіла ўвазе наведнікаў дырэктар Зінаіда Кучар. Цікава, што з гэтай установай скульптара звязвае не толькі праца над вобразам заснавальніка беларускай прафесійнай драматургіі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (1983), але і тое, што першыя крокі на творчым шляху А. Шатэрнік зрабіў у якасці сцэнографа ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага.

Наогул, А. Шатэрнік – асоба шматгранная: ён не толькі скульптар, але і майстра жывапісу, а таксама мае літаратурны талент – паэт і добры эсэіст. Як адзначыў старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор Сітніца, які ведае юбіляра ўжо больш за сорак гадоў, талент А. Шатэрніка як жывапісца, які бязмежна любіць Беларусь, прызнаны ў капрызнай (і часам зайздроснай!) мастацкай грамадзе. Р. Сітніца ўручыў юбіляру «Ганаровае адзначэнне БСМ», ахарактарызаваў яго як яркага, змястоўнага і запамінальнага чалавека і аднёс да людзей Беларускага Космасу.

Сябра музея мастак Эдуард Агуновіч падкрэсліў мастацкія вартасці скульптурных вобразаў Якуба Коласа, Яўгена Куліка, створаных А. Шатэрнікам.

Радзім Гарэцкі падкрэсліў значнасць грамадскай дзейнасці скульптара – «сучаснага адраджэнца», які вяртае з нябыту імёны беларускіх вучоных, прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, увекавечвае памяць пра іх.

А далей пра шчодрасць і шчырасць творцы нагадаў паэт Уладзімір Някляеў. Родныя Генадзя Бураўкіна выказалі падзяку А. Шатэрніку за ўсталяваны на Усходніх могілках помнік. Шмат добрых словаў гучала у адрас юбіляра. А З. Кучар як навуковы кіраўнік экспазіцыі музея-сядзібы М.К. Агінскага прапанавала чарговую выстаўку А. Шатэрніка зладзіць у Залессі.

Напрыканцы імпрэзы творца падзякаваў за ўвагу да сваёй асобы, пашкадаваў, што не паспеў пакуль здзейсніць шмат што з задуманага. А таксама зазначыў, што галоўны мастак – Усявышні, які стварыў для сусвету людзей, а задача мастака і скульптара – назіраць і адлюстроўваць іхнюю прыгажосць.

Мы ж чакаем сустрэчы з новымі творамі мастака на чарговых выстаўках і ў гарадской прасторы.

*Наш кар.*
*Фота*
*Наталі КУПРЭВІЧ*

## Восень

*Пачарнела зямелька мая,*
*Дождж ідзе, бусел больш не клякоча.*
*Меней сонейка грэе штодня,*
*Сваім лісцейкам лес не шапоча.*

*Сад прыціх, птушкі ў ім не пяюць,*
*На душы ў мяне смутку даволі…*
*Толькі хмары над вёскай плывуць,*
*Золкі вецер гуляе ў полі.*

*Нават рэчка павольна цячэ –*
*Заблудзілася недзе ў дарозе.*
*І ў пунсова-ружовай красе*
*Маці-восень стаіць на парозе…*

*Нам застаўся адзін успамін:*
*Як нас песціла бабіна лета*
*У праменнях сваіх павуцін –*
*Мы ўдзячны табе за ўсё гэта…*

*Соф'я МАРОЗ,*
*в. Забалацце Асіповіцкага раёна*



*Карціна А. Шатэрніка, прысвечаная Залессю М.К. Агінскага*

# Чалавек, важны для нацыі

***Ёсць людзі, лёсы якіх знітаваныя з пакручастаю гісторыяй усяго народа. Сярод іх – украінец Васыль Стус, паэт, празаік і перакладчык, праваабаронца. Сёлета споўнілася 30 гадоў з дня яго заўчаснай трагічнай смерці. З гэтай нагоды, а таксама з нагоды выхаду кнігі «Небо. Кручі. Провалля. Вода» (ілюстрацыі да якой зрабіла беларуская мастачка Марына Мароз), у мінскім Доме дружбы Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі прайшла вечарына, прысвечаная В. Стусу.***

Напачатку ж – некалькі фактаў з біяграфіі класіка. Нарадзіўся 6 студзеня 1938 г. у сяле Рахніўка (Вінніцкая вобласць). Каб унікнуць прымусовай калектывізацыі, бацькі пераязджаюць у г. Сталіна (цяперашні Данецк). Тут хлопец скончыў школу і гісторыка-літаратурны ўніверсітэт мясцовага педагагічнага ўніверсітэта (цяпер Данецкі нацыянальны ўніверсітэт). Далей – праца настаўнікам, на шахце, у радакцыі; потым – аспірантура Інстытута літаратуры імя Т. Шаўчэнкі Акадэміі навук УССР. Тады былі падрыхтаваныя зборнікі вершаў «Круговерть» і «Зимові дерева» (з'явіліся ў «самвыдаце»), выйшлі літаратурна-крытычныя артыкулы, надрукаваныя пераклады з Г. Гётэ, Р.М. Рыльке, Ф.Г. Лоркі. У творчасці яднаў украінскую традыцыю з найлепшымі ўзорамі сусветнай, найперш еўрапейскай, класікі. Захапляўся творчасцю М. Рыльскага, Э. Верхарна, Б. Пастэрнака, А. Камю. З часам яго прывабіла ідэя «свабоды жыццёвага шляху», прыйшло разуменне ў неабходнасці



*Сын распавядае пра татку*

зберажэння і развіцця ўкраінскай культуры. За гэтыя перакананні, а таксама за праваабарончую дзейнасць, зазнаў рэпрэсіі з боку савецкіх уладаў: яго творчасць была пад забаронаю, сам быў асуджаны да зняволення, тэрміны адбываў у Мардовіі, каля Магадана, у Пензе. Лагернымі наглядчыкамі было знішчана блізу 300 вершаў зняволенага паэта. Ён неаднаразова абвяшчаў галадоўкі на знак пратэсту супраць жорсткага абыходжання лагернай адміністрацыі. Памёр (магчыма, ад пераахалоджвання) уначы з 3 на 4 верасня 1985 г. у лагеры непадалёк сяла Кучына Пермскай вобласці. Афіцыйная фармулёўка – спынілася сэрца.

Быў пахаваны на лагерных могілках, а ў 1989 г. перапахаваны ў Кіеве. У 2001 г. на фасадзе філалагічнага корпуса Данецкага дзяржуніверсітэта быў усталяваны барэльеф у гонар славутага выпускніка (знішчаны сёлета ў маі), працаваў Данбаскі гісторыка-літаратурны музей Васыля Стуса. 26 лістапада 2005 г. Стусу пасмяротна прысвоена званне Героя Украіны з узнагароджаннем ордэнам Дзяржавы.

Вечарына ў Доме дружбы, што прайшла пры падтрымцы Прэзідэнцкага фонду Леаніда Кучмы «Украіна», пачалася з выступлення часовага ўпаўнаважанага ў справах Украіны ў Рэспубліцы Беларусь Валерыя Джыгуна, які засяродзіў увагу прысутных на значнасці асобы і творчасці В. Стуса, якога ўжо даўно называюць класікам сучаснай украінскай літаратуры. А цэнтральнаю падзеяй сустрэчы стаў выступ сына паэта – пісьменніка, літаратуразнаўцы, рэдактара Дмытра Стуса, кандыдата філалагічных навук, сябры Асацыяцыі ўкраінскіх пісьменнікаў, генеральнага дырэктара Нацыянальнага музея Тараса Шаўчэнкі, даследчыка творчасці свайго бацькі. Госць не толькі чытаў вершы, але і распавядаў пра бацьку, дзяліўся ўражаннямі ад праміналых падзеяў, разважаў пра гісторыю сваёй краіны.

– Украінская гісторыя вельмі цесна звязаная з перапахаваннямі, што сталіся сімвалічнымі для краіны. Першым быў Тарас Шаўчэнка, перапахаванне якога ў 1861 г. стала штуршком да абуджэння нацыянальнай самасвядомасці. Пачалі з'яўляцца суполкі, арганізацыі, аб'яднанні; за некалькі дзесяцігоддзяў мы пераскочылі ад народа да сучаснай украінскай нацыі, была сфармаваная першая нацыянальная палітычная партыя, стала магчымым стварыць незалежную дзяржаву. Другім штуршком было пахаванне прывезенай з Грузіі (памерлай там) Лесі Украінкі – таксама нашага класіка. Быў закладзены рух па стварэнні незалежнай дзяржавы ў 1920-х гг. У Кіеве пад час перапахавання Стуса былі ўпершыню ўзнятыя жоўта-блакітныя і чорна-чырвоныя сцягі. Праз два гады Украіна выбрала, здабыла сабе незалежнасць. Можа быць, пачуццё ўласнай годнасці, якое мой бацька адстойваў усё сваё жыццё, чым адстойваў годнасць усяго народа, зрабіла яго нацыянальным сімвалам, надзвычайна важным для сучаснай Украіны.

Слухаючы гэта, згадаўся наш класік, Максім Багдановіч, які памёр, пахаваны і спачывае ў далёкай зямлі. Ці стала б ягонае перапахаванне такім штуршком для грамадзянаў сучаснай Беларусі?

Выступіў пад час імпрэзы паэт і перакладчык Міхась Скобла, які палымяна распавёў пра сваё знаёмства з культурай брацкага народа яшчэ ў Савецкай Арміі, калі праходзіў службу ў УССР. І прачытаў свае пераклады з В. Стуса на беларускую мову. Мастачка Марына Мароз распавяла аб сваёй працы над кнігаю. Пад час імпрэзы адбылося прадстаўленне выстаўкі графікі кіеўскіх мастачак Таццяны і Кацярыны Ачарэдзькаў (яны сябры Украінскага саюза мастакоў, стыпендыяты Прэзідэнцкага фонду Л. Кучмы «Украіна»).

*Уладзімір ПУЧЫНСКІ,*
*фота аўтара*

## Лістапад

**8 – Янка Пачопка** (**Іван Пятровіч**; 1890, Глыбоцкі р-н – 1977), паэт, празаік, фальклярыст, прапагандыст сельскагаспадарчых ведаў – 125 гадоў з дня нараджэння.

**8 – Святаполк Ізяславіч** (у хрышчэнні **Міхаіл**; 1050 – 1113), князь полацкі, тураўскі, вялікі князь кіеўскі – 965 гадоў з дня нараджэння.

**8 – Суднік Міхаіл Раманавіч** (1910, Полацкі р-н – 1995), мовазнаўца, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1980) – 105 гадоў з дня нараджэння.

**9 – Лук'янчыкаў Сяргей Пятровіч** (1945, Расія), рэжысёр і сцэнарыст дакументальнага кіно, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1980), уладальнік прызоў і ўзнагарод міжнародных кінафестываляў – 70 гадоў з дня нараджэння.

**9 – Тышко Леанід Барысавіч** (1945, Брэст), музыкант, артыст эстрады, заслужаны артыст Беларусі, адзін са стваральнікаў ВІА «Песняры» – 70 гадоў з дня нараджэння.

**9 – Шпіт Юрый Васілевіч** (1930, Украіна – 2008), архітэктар, сярод асноўных працаў якога – храм святога апостала Андрэя Першазванага (Мінск), шматлікія будынкі і помнікі ў Мінску, Віцебску, Наваполацку, Бабруйску і інш. гарадах, заслужаны архітэктар Беларусі (1969), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984) – 85 гадоў з дня нараджэння.

**11 – Кужанецкі Марцін** (1705, Польшча – 1769), дзеяч Рымска-Каталіцкай Царквы ў Беларусі, педагог – 310 гадоў з дня нараджэння.

**11 – Паўловіч Альберт Францавіч** (1875, Мінск – 1951), паэт-гумарыст, драматург, перакладчык, мастак – 140 гадоў з дня нараджэння.

**11 – Радзівіл Марцін Мікалай Кароль** (1705, Капыльскі р-н – 1782), дзяржаўны дзеяч ВКЛ – 310 гадоў з дня нараджэння.

**11 – Тычко Галіна Казіміраўна** (1955, Мёрскі р-н), крытык, літаратуразнаўца, даследчыца маральна-этычных пошукаў у сучаснай беларускай прозе – 60 гадоў з дня нараджэння.

**11 – Чабярук Алена Іванаўна** (1925, Барысаўскі р-н – 2007), мовазнаўца, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1971), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2000) – 90 гадоў з дня нараджэння.

**12 – Міхайла Грамыка** (**Міхаіл Аляксандравіч**; 1885, Рэчыцкі р-н – 1969), пісьменнік, драматург, тэатральны крытык, педагог, вучоны-геолаг, аўтар падручнікаў па геаграфіі і геалогіі – 130 гадоў з дня нараджэння.

**12 – Макаёнак Андрэй Ягоравіч** (1920, Рагачоўскі р-н – 1982), драматург, народны пісьменнік Беларусі, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы (1962), Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1974) – 95 гадоў з дня нараджэння.

**12 – Скрыпнічэнка Георгій Сяргеевіч** (1940, Украіна – 2015), беларускі мастак, які працаваў у розных жанрах станковага жывапісу, станковай і кніжнай графікі, – 75 гадоў з дня нараджэння.

**13 – Атраховіч Алена Ігараўна** (1955, Мінск), мастацкі крытык, мастацтвазнаўца, мастак – 60 гадоў з дня нараджэння.

**13 – Крыкава Валянціна Іванаўна** (1930, Расія), артыстка балета, народная артыстка Беларусі – 85 гадоў з дня нараджэння.

**14 – Міхась Васілёк** (сапр. **Касцевіч Міхаіл Восіпавіч**; 1905, Гродзенскі р-н – 1960), паэт, аўтар зборнікаў вершаў, адзін з найбольш вядомых паэтаў Заходняй Беларусі – 110 гадоў з дня нараджэння.

**14 – Драгічынскі ваенна-гістарычны музей імя Д.К. Удавікова** (Драгічын; 1990), мае ганаровае званне «народны» – 25 гадоў з часу заснавання.

**14 – Масляніцына Ірына Аляксандраўна** (1965, Расія), пісьменніца, драматург, журналістка, аўтар гісторыка-біяграфічных нарысаў аб выдатных і знакамітых асобах у гісторыі Беларусі, зборнікаў беларускіх паданняў і легендаў – 50 гадоў з дня нараджэння.

**14 – Мацьковяк Уладзіслаў** (1910, Польшча – 1942), рэлігійны дзеяч, блажэнны Рымска-Каталіцкай Царквы – 105 гадоў з дня нараджэння.

## Бяда ад тэлефона

Сёння нячаста можна сустрэць чалавека, які не карыстаўся б мабільным тэлефонам. Гэта рэч карысная і патрэбная, але варта помніць, што тэлефон можа быць і вельмі небяспечным.

Апошнія некалькі гадоў павялічылася колькасць пажараў з-за мабільных тэлефонаў. Часцей за ўсё такія выпадкі адбываюцца ўначы, менавіта тады, калі большасць людзей зараджае свае тэлефоны. На жаль, менавіта таму, што пажары адбываюцца ноччу, на іх вельмі часта гінуць людзі.

Пажарная небяспека мабільных тэлефонаў звязаная з тым, што яны зробленыя з матэрыялаў, якія лёгка загараюцца, – у апарата звычайна пластмасавы корпус, прагумаваныя кнопкі ды інш. Тэлефон можа загарэцца пад час зарадкі, таму што яго корпус і корпус зараднага прыстасавання, таксама зробленага з палімерных матэрыялаў, пачынаюць празмерна награвацца. Тэлефон зараджаецца дзве-тры гадзіны, і пры гэтым часта ён ляжыць на гаручых паверхнях – драўляных прываконнях, камодах, сурвэтках, абрусах і інш. «Эпіцэнтрам» загарання тэлефона з'яўляецца месца яго кантакту з паверхняй. Тэмпература ў гэтым месцы павялічваецца, і калі яна перавышае дапушчальныя для гаручых матэрыялаў значэнні, адбываецца загаранне. Горш за ўсё, што нават пры загаранні тэлефон яшчэ нейкі час застаецца падключаным да электрычнай сеткі, і паверхня ў месцы кантакту працягвае награвацца.

Таму, каб не стаць ахвярай мабільнага тэлефона, трэба не пакідаць яго падключаным да электрычнай сеткі без нагляду, асабліва ўначы.

*Дзяніс ПРОЦЬКА, начальнік ЦРАНС г. Мінска*



*Фота Уладзіміра ПУЧЫНСКАГА*

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

*(Пачатак у № 1 за 2003 год)*

**НЕСЦЕРКА** – герой беларускіх народных казак; разумны і спрытны бядняк, які ў любых сітуацыях знаходзіць выйсце і можа перахітрыць і паноў, і папоў. Казкі з героямі, падобнымі да Несцеркі, ёсць у рускім, літоўскім і польскім фальклоры. На аснове беларускіх казак пра дасціпнага і знаходлівага бедняка В. Вольскі напісаў прасякнутую яркім нацыянальным гумарам камедыю «Несцерка».

**НЕФ** (*франц.* nef ад *лац.* navis карабель), **карабель** (у архітэктуры) – прадаўгаватае памяшканне, частка інтэр'ера, абмежаваная з аднаго ці абодвух бакоў шэрагам калонаў або слупоў. Адрозніваюць нефы сярэдні, бакавыя і папярочны (трансепт).

Вядомы са старажытнасці ў базілікальных збудаваннях. У беларускай архітэктуры нефы пашырыліся з XVI ст. Звычайна будынкі складаліся з 1 ці 3 нефаў. Сярэдні быў вышэйшы за бакавыя, асвятляўся невысокімі прамавугольнымі або арачнымі вокнамі над дахамі бакавых нефаў, у алтарнай частцы завяршаўся апсідай або прэсбітэрыем (у некаторых храмах існавалі сярэднія нефы без апсідаў). На скрыжаванні сярэдняга нефа і трансепта часта рабілі купал на барабане (касцёл езуітаў у Гродне), у бакавых нефах размяшчалі алтары (касцёл францысканцаў у Пінску). У архітэктуры готыкі нефы мелі складаныя ўзорыстыя скляпенні (царква-крэпасць у в. Мураванка Шчучынскага р-на); у архітэктуры барока і класіцызму сярэдні неф звычайна перакрываўся цыліндрычным з распалубкамі, бакавыя – крыжовымі скляпеннямі (касцёл у в. Сталавічы Баранавіцкага р-на). Скляпенні нефа ўпрыгожвалі дэкаратыўнай лепкай (касцёл у в. Чарнаўчыцы Брэсцкага р-на), размалёўкай (касцёл езуітаў у Нясвіжы).



*Неф базілікі Св. Пятра ў Рыме*

**«НЁМАН»** – шклозавод у г. Бярозаўка Лідскага р-на. Заснаваны ў 1883 г. майстрамі прамысловага шкларобства Ю. Столе і В. Краеўскім. Як буйное прадпрыемства шклозавод сфармаваўся ў 1910 г. (1 000 рабочых). Выраблялі сталовы і гаспадарчы, аптэчны і парфумны посуд, лямпы, лямпавае шкло, вазы, мастацкае шкло. 45 % вырабаў экспартавалі за мяжу. У Вялікую Айчынную вайну быў разбураны, адноўлены ў 1944 г.

З канца 1950-х гг. на заводзе працуюць прафесійныя мастакі; у пачатку 1960-х гг. створаная спецыяльная брыгада для выканання эталонаў. У канцы 1960-х гг. створаныя брыгады па выдзіманні гутных вырабаў вялікімі серыямі, у т.л. дробнай пластыкі. Самабытнасцю формаў і кампазіцыйнага вырашэння, арыгінальнасцю ўпершыню распрацаваных дэкораў вылучаюцца творы мастакоў і майстроў розных пакаленняў (Г. Ісаевіч, У. Мурахвера, Л. Мягковай, С. Раўдвеэ, В. Дзівінскай, У. Жохава, К. Вакс, Т. Малышавай, В. Сазыкінай, Р. Багінскага, Федаркова), майстра шліфоўкі І. Бартосіка і інш. Лепшыя вырабы дэманстраваліся на міжнародных выстаўках і кірмашах у Лейпцыгу, Лондане. Бруселі, Будапешце, Вене, Гаване, Дамаску, Каіры, Маскве, Манрэалі, Нью-Дэлі, Парыжы, Плоўдзіве, на персанальнай выстаўцы ў ЗША (1963 – 1973) і інш. Завод узнагароджаны бронзавым медалём на сусветнай выстаўцы «ЭКСПО-58» у Бруселі, на міжнародных выстаўках у г. Ябланец (Чэхія) Гран-пры і залатымі медалямі ў 1973 і 1979 гг.




*Шклозавод «Нёман»*

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэўш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26. Тэл./факс 334-42-03
E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 05.11.2015
Газета надрукавана ўдрукарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 23.01.2014.
Заказ 714.
Тыраж 816 асобнікаў.